# МУЗЫЧНАЯ КУЛЬТУРА ЯК СІСТЭМА: СТРУКТУРА І ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ ДЫФЕРЭНЦЫЯЦЫЯ

**А.М. Емялёва**
*старшы выкладчык кафедры беларускай*
*і сусветнай мастацкай культуры*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Музычная культура гэта працэс, у якім спалучаюцца музычнае мастацтва і культура ў цэлым. У шырокім сэнсе размова павінна ісці аб праблеме спецыфікі музыкі, бо дадзеная спецыфіка – гэта і ёсць мяжа паміж асаблівым, уласцівым адной толькі музыцы, і агульным, уласцівым культуры ў цэлым. Менавіта з гэтага пункту гледжання магчыма бачыць сувязь музыкі і культуры, і яе спецыфічную вылучанасць у культуры ў паняцці «музычная культура».

Разам з тым, «агульнае» – культура, з’яўляецца гэткім жа маналітным і структурна падзеленым, як і «асобнае» – музычнае мастацтва. Таму праблема спецыфікі музыкі – «асобнага, якое з’яўляецца агульным» – мае шмат аспектаў. Музыка, як спецыфічная з’ява культуры, як частка мастацкай культуры выступае ў выглядзе гісторыі, каштоўнасці, сэнсу. Дадзеная спецыфіка музыкі і ствараe поле даследавання ў галіне музычнай культуры.

Удасканальванне духоўнага жыцця грамадства на сучасным этапе ўсё ў большай ступені залежыць ад распрацоўкі навуковых уяўленняў аб культуры ў цэлым. Таму ўсе бакі духоўнай сферы патрабуюць інтэнсіўнай і завостранай увагі.

Культура прадстаўляе спецыфічны спосаб арганізацыі і развіцця чалавечай жыццядзейнасці, прадстаўлены ў прадуктах матэрыяльнай і духоўнай працы, у сістэме сацыяльных норм і ўстаноў, у духоўных каштоўнасцях, у сукупнасці адносін людзей да прыроды, паміж сабой і да саміх сябе.

У паняцці культура фіксуецца своеадметнасць гістарычна- канкрэтных форм дзейнасці на розных этапах грамадскага развіцця, у межах вызначаных эпох, грамадска-эканамічных фармацый, этнічных і нацыянальных супольнасцей. Культура характэрызуе асаблівасці свядомасці і дзейнасці людзей у канкрэтных сферах грамадскага жыцця, напрыклад, у мастацкай (музычнай) сферы. У культуры фіксуецца спосаб жыццядзейнасці асобнага індывіда, сацыяльнай групы (культура магнатаў і шляхты), або ўсяго грамадства ў цэлым.

На сучасным этапе адчуваецца патрэба ў вывучэнні культуры ў яе мнагамерных сувязях з сукупным духоўным вопытам, з грамадскай практыкай і з улікам сутнасці культурна-гістарычнага працэса. Больш актуальным становіцца вывучэнне яе сутнасці, унутранай структуры, спосабаў і форм функцыянавання, залежнасці тэмпаў і напрамкаў яе развіцця ад іншых сфер сацыяльнага жыцця і розных грамадскіх інстытутаў, а таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адваротнага ўздзеяння на іх культурных фактараў. Далейшае ўзбагачэнне духоўнага патэнцыяла грамадства патрабуе аналітычнага асэнсавання культуры і распрацоўкі навукова-тэарэтычнага апарата для вывучэння ўсіх яе сфер, для даследавання яе ўздзеяння на развіццё грамадства як суцэльнага арганізма.

Развіццё музычнай культуры мае сваю спацыфіку, таму належыць асэнсаваць асаблівасці развіцця у гэтай сферы, выявіць унікальныя своеасаблівыя рысы дадзенага працэса. Асаблівасці сучаснага этапа вывучэння музычнай культуры знаходзяцца ў комплексным падыходзе, у даследаванні яе сувязі з усімі працэсамі жыццядзейнасці грамадства. Такая пазіцыя дазваляе адчыніць механізмы ўздзеяння культурных норм і каштоўнасцей на дынаміку грамадскага жыцця. Для гэтага неабходна прааналізаваць агульны працэс развіцця музычнай культуры, устанавіць сувязі культурных феноменаў розных эпох, выявіць залежнасць характара музычнай культуры ад змены грамадскіх фармацый, вывучыць культурны змест канкрэтных эпох, што дазволіць адрозніць адзін перыяд ад другога, або вылучыць яго спецыфіку ў агульным гістарычным працэсе.

У межах агульнасістэмнага падыхода музычная культура у шырокім сэнсе слова разглядаецца як вызначаная цэласнасць, як складаны грамадскі феномен, які ахоплівае розныя бакі духоўнай дзейнасці грамадства і творчай самарэалізацыі чалавека, як жывы, адзіны арганізм адкрытай, цэласнай, многасэнсавай і поліфункцыянальнай сістэмы.

Музычная культура розных краін і эпох адрозніваецца па сваіх асаблівасцях. У сваю чаргу мае асаблівасці і музычная культура Беларусі, як сістэма, і музычная сістэма асобнага горада, як яе падсістэма. Абедзьве знаходзяцца ў іерархічным падчыненні да беларускай мастацкай культуры, а апошняя – да культуры Беларусі ў цэлым.

У розныя гістарычныя перыяды музычная культура вызначалася неаднолькава, яна мела свае арыгінальныя рысы і формы арганізацыі. Таму вызначыць сутнасць паняцця музычнай культуры дапамагаюць факталагічныя прыклады, іх структураванне як па вертыкалі, так і па гарызанталі, і лагічнае іх аналізаванне.

Для распрацоўкі паняцця музычнай культуры неабходна сэнсавае размежаванне тэрміналагічнага апарата, у які ўваходзяць такія вызначэнні, як: музычная культура, сістэма музычнай культуры, музычная дзейнасць, музычная творчасць, музычнае выканальніцтва і ўспрымальніцтва, музычнае мастацтва.

Музычная культура – гэта сістэма, якая садзейнічае здольнасцям грамадства ствараць, адэкватна ўспрымаць і правільна ацэньваць музычнае мастацтва ўсіх форм, відаў, жанраў; сукупнасць створаных музычных каштоўнасцей, іх інтэрпрэтацый і ацэнак ў мастацкай крытыцы, эстэтыцы і грамадскай думцы. Музычная культура адносіцца да сферы мастацкай культуры, а побач з рэлігіяй, мараллю, навукай і філасофіяй – да сферы духоўнай культуры. Разам з іншымі відамі музычнай дзейнасці – распаўсюджваннем і прапагандай музыкі, навуковымі даследаваннямі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

галіне музыкі, музычнай крытыкай, падрыхтоўкай кадраў – творчасць, выканальніцтва і ўспрыманне ствараюць музычную культуру грамадства. У сваю чаргу, кожнаму з гэтых відаў дзейнасці ўласціва свая структура. Так, у развітай музычнай культуры творчасць прадстаўлена многімі living рознавіднасцямі, якія могуць быць дыферынцаваны па розных прыкметах:

– па тыпу зместу: музыка лірычная, эпічная, драматычная, гераічная і г.д.;

– па выканальніцкаму прызначэнню: музыка вакальная і інструментальная;

– па сінтэзу з іншымі відамі мастацтва: тэатральная музыка, танцавальная, праграмная інструментальная;

– па жыццёвых функцыях: музыка ўжытковая і неўжытковая;

– па ўмовах гучання: музыка для праслухоўвання ў спецыяльных умовах (прафесійная), музыка для масавага выканання і праслухоўвання ў звычайных жыццёвых абставінах (аматарская).

Пытанне аб сутнасці музычнай культуры – гэта пытанне аб узаемадзеянні трох галоўных іпастасяў – творчасці, выканальніцтва і ўспрымання твораў музычнага мастацтва, падпарадкаваных галоўнай мэце – фарміраванню эстэтычна выхаванай, прафесійна падрыхтаванай творчай індывідуальнасці, слухацкай аўдыторыі, і ў рэшце рэшт, стварэнне адметнай, своеасаблівай рэгіянальнай музычнай культуры.

Паступальны рух развіцця музычнай культуры часта перапыняўся рознымі з'явамі, варыятыўнымі формамі, адыходзіў ад асноўнага перспектыунага шляху развіцця. Але з цягам часу сэнсавая напоўненасць, творчы патэнцыял, багацце форм, жанраў ўзрасталі, набіралі моц і сістэма музычнай культуры ўпэўнена пракладвала шлях і станавілася адной з сэнсавых асноў музычна-гістарычнага працэсу. Усё гэта адкрывала магчымасць для плённага развіцця творчага патэнцыялу культуры у цэлым.

Пры вызначэнні паняцця «сістэма» неабходна ўлічваць цесную ўзаемасувязь з паняццямі цэласнасці, структуры, сувязі, элемента, адносін, падсістэмы. Асноўным прынцыпам, на якім будуецца паняцце музычнай культуры як сістэмы з'яўляецца цэласнасць. Цэласнае развіццё музычнай культуры ўплывала на развіццё яе арганізацыйных форм. У цэлым, фарміраванне сістэмы музычнай культуры вызначалася адпаведнасцю развіцця ўзроўню мастацкай культуры наогул. Чым больш яна расчыняла сферу свайго ўздзеяння на фарміраванне музычнага асяроддзя і станавілася даступнай большай колькасці людзей, тым больш магчымасцяў для развіцця атрымоўвала мастацкая культура ў цэлым.

Кожны этап развіцця сістэмы музычнай культуры сутнасна адпавядаў мастацкім крытэрыям пэўнай сацыякультурнай эпохі, што рабіла дадзеныя магчымасці музычнай культуры непаўторнымі і вызначала іх як самастойныя мастацкія здабыткі. Таму кожны больш высокі ўзровень развіцця музычнай культуры не павінен перакрэсліваць каштоўную значнасць музычна-мастацкіх працэсаў папярэдніх эпох і часоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фарміраванне такой важнай арганізаванай сістэмы як музычная культура заўсёды ўплывала на развіццё ўсёй структуры мастацкай культуры, на вядучыя прынцыпы яе жыццядзейнасці, творчыя інтэрпрэтацыі, метады і сродкі выканання. Такая ўзаемасувязь прынцыпаў мастацкай і музычнай культуры абумоўлівае іх узаемазалежнасць.

Цэласнасць паняцця «сістэма музычнай культуры» грунтуецца на нацыянальных традыцыях, музычна-мастацкіх прынцыпах, мастацка-стылявых напрамках, музычна-эстэтычным светаўспрыманні, жанравай featuresнабаковасці, рэгіянальных адметнасцях. Дадзеныя элементы ў розныя гістарычныя перыяды ўзнікалі, развіваліся, ўзаемадзейнічалі, змяняліся і ў сукупнасці фарміравалі вызначаную сістэму музычнай культуры.

Важным для фарміравання паняцця сістэмы музычнай культуры з'яўляецца разуменне сукупнасці мастацкіх працэсаў, якія ішлі ў межах розных відаў мастацтва і вызначаліся адзіным функцыянальным прызначэннем, дамінантным ва ўмовах пэўнай сацыякультурнай эпохі. Напрыклад, функцыянальнае прызначэнне музычна-мастацкіх працэсаў у эпоху Сярэднявечча абумоўлівалася сутнасцю рэлігійнага выхавання, якое канцэнтравалася у хрысціянскім храме. У эпоху Адраджэння музычна-мастацкія прынцыпы развіваліся на аснове дзейнасці ўстаноў розных канфесій: праваслаўнай, каталіцкай, пратэстанцкай і інш. У эпоху Асветніцтва адбылася дыферэнцыяцыя 2-х кірункаў: культавага і свецкага музычнага мастацтва.

Працэс фарміравання сістэмы музычнай культуры, яе змяненні накіраваны на якасныя параўтварэнні форм, прынцыпаў, відаў, жанраў, ладагарманічнай мовы, выканальніцкіх і аўтарскіх асаблівасцяў, ўспрымальніцтва музычнай мовы і стыля. У гэтым працэсе адбываецца пастулальнае ўзыходжанне ад ніжэйшых ступеняў, ўзроўняў да вышэйшых, тым самым перабудоўваецца і ўскладняецца структура сістэмы музычнай культуры.

Працэс стварэння і функцыянавання музычнага мастацтва здзяйсняецца у асобнай сферы культуры, якая і называецца музычнай культурай. Яна аб'ядноўвае у адзінае сістэмнае і гістарычна змяняючаяся цэлае музычнае стварэнне, ўжыванне, крытыку, навуку, музычныя каштоўнасці, носьбітамі якіх з'яўляюцца творы музычнага мастацтва.

Такім чынам, сістэма музычнай культуры, сукупнасць і ўзаемазалежнасць яе структурных элементаў дае магчымасць разглядаць музычную культуру як суцэльны кангламерат, які цесна звязаны з агульнай сістэмай мастацкай культуры і сацыякультурнымі з'явамі краіны.

---

1. *Лукач, Д.* Своеобразие эстетического : в 4 т. : [пер. с нем.] / общ. ред. и послесл. К.М. Долгова. – М. : Прогресс, 1985–1987. – (Для научных библиотек). – Т. 1. – 1985. – 335 с.

2. *Адорно, Т.В.* Избранное : социология музыки / Теодор В. Адорно ; [редкол.: пер. : М.И. Левина, А.В. Михайлов, сост. : С.Я. Левит, С.Ю. Хурумов, отв. ред. Л.Т. Мильская]. – М. ; СПб. : Университетская книга, 1999. – 445 с. – (Книга света / редкол.: Л.В. Скворцов (пред.) [и др.]).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Чередниченко, Т.В.* Тенденции современной западной музыкальной эстетики. К анализу методологических парадоксов науки о музыке / Т.В. Чередниченко. – М. : Музыка, 1989. – 223 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ